ВЕРАСЕНЬ – СНЕЖАНЬ 2024
TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР



У 2024 г. AI становіцца не толькі больш «разумным», але і больш дасяжным для ўсё большай колькасці людзей. Каб прыцягнуць увагу аўдыторыі, мы генеруем малюнкі для вокладкі агляда з дапамогай AI і на падставе падзей, што адбываюцца ў Беларусі.

У трэцім трыместры стала асабліва заўважна, што ў легалізацыі рэпрэсій дзяржава ідзе па другім коле, то бок увносіць яшчэ больш жорсткія змены ў ўжо і так змянёныя раней у рэпрэсійным ключы нормы.

На малюнку, згенераваным Shutterstock.AI, стомлены дзік не можа сысці з разагнанай каруселі. Важна разумець, што нам усім добра было б не проста злезці з каруселі, але і спыніць саму карусель.

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

© Беларускі Хельсінскі Камітэт, 2025

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** 4

**РЭЗЮМЭ** 6

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 10

Пашырэнне легалізацыі сістэмных рэпрэсій 10

Палітыка па фармалізацыі дыскрымінацыі па прыкметах сэксуальнай арыентацыі, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадукцыйнага выбару 16

Пашырэнне прымянення неправавых пазасудовых працэдур 17

Індактрынацыя у адукацыі: фармалізацыя праўладных наратываў аб падзеях 2020 18

Станоўчыя змены ў сферы пенсійнага забеспячэння 19

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 21

Пераслед ЛГБТК+ супольнасці 21

Новыя практыкі кантролю ў сувязі з перасячэннем мяжы 21

Узмацненне кантролю на працоўных месцах 22

Новыя практыкі пры затрыманнях 22

Новыя практыкі пераследу паводле артыкулаў аб экстрэмізме 22

**III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ДАТЫЧНЫХ ДА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ** 24

Зварот Літвы ў Міжнародны крымінальны суд у сувязі з сітуацыяй у Беларусі 24

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў. У сувязі з неабгрунтаваным ужываннем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 г. і распачатымі за імі рэпрэсіямі, у сакавіку 2021 г. быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН, які ў 2024 г. быў заменены групай незалежных экспертаў, што азначае большую самастойнасць і незалежнасць гэтага механізму.

З 2019 г. БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертаў:к ацэньваюць змены асобна па кожным пункце каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі.[1]

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[2] канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтым патоку інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, і куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Для гэтага з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных змен у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

---

1 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; маніторынгі і Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.media/ru/aglyady_category/monitoringi-bazh/ і інш*

2 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;

- *правапрымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;

- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Нашая аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Аналітыка за 2023 г. прадстаўленая ў 2-х аглядах (за кожныя паўгода). Выпускі за 2023 г., а таксама зводную аналітыку за год у выглядзе інтэрактыўнай прэзентацыі можна знайсці тут.

У 2024 г. агляд выйдзе тройчы (па выніках кожных чатырох месяцаў). Выпуск за студзень-красавік і май-жнівень 2024 г. можна знайсці тут.

**Вы можаце падпісацца на наш агляд тут**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

**trends.belhelcom.org**

# РЭЗЮМЭ

- Да канца году стала асабліва заўважна, што ў легалізацыі рэпрэсій дзяржава ідзе па другім коле, г.зн. уносіць яшчэ больш жорсткія змены ва ўжо і так змененыя раней у рэпрэсійным ключы нормы. Такім чынам умацоўваецца піраміда рэпрэсіўнага заканадаўства. Складана сцвердзіць, ці гэта ліквідацыя прабелаў у паспешліва прынятым рэпрэсіўным заканадаўстве ці проста неабходнасць пастаяннай «падкормкі» сістэмы на фоне вычарпання рэпрэсіўных інструментаў.

- Эвалюцыянуюць змены, датычныя забеспячэння гарантый і абароны прэзідэнта, які пакідае гэтую пасаду. Цяпер яны забяспечаныя на ўзроўні крымінальнай адказнасці. У Крымінальны кодэкс уведзены новы артыкул: «Гвалт ці пагроза ў дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у тым ліку таго, хто спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў», а ранейшыя склады, якія датычаць паклёпу і абразаў прэзідэнта, дапоўненыя фармулёўкай «у тым ліку таго, хто спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў». Два апошнія артыкулы актыўна выкарыстоўваюць улады для палітычна матываванага пераследу. Уведзеныя нормы могуць служыць дадатковымі фармальнымі падставамі для адвольнага пераследу.

- Фармалізаваная падстава для пераследу за паведамленне аб наяўнасці/перасоўванні расійскай вайсковай тэхнікі на тэрыторыі Беларусі: уведзены новы склад «Несанкцыянаваны распаўсюд інфармацыі аб размяшчэнні альбо перамяшчэнні падраздзяленняў, узбраення, вайсковай тэхнікі і баепрыпасаў». Да гэтага людзей пераследавалі за такія дзеянні па іншых артыкулах: спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 361-4), удзел у экстрэмісцкім фармаванні (361-1), здрада дзяржаве (356). Гэта чарговая праява фармалізацыі супрацьпраўнасці дзеянняў для адвольнага рэтраспектыўнага пераследу. Гэта адбываецца, калі асобныя дзеянні, не ахопленыя раней спецыяльнымі нормамі Крымінальнага кодэксу, караліся па іншых артыкулах, якія часцяком не звязаныя наўпрост з фактычнымі дзеяннямі.

- Відавочна, улады шукаюць новыя падставы для завядзення палітычна матываваных крымінальных справаў на тых, хто вымушана з’ехаў. Істотна пашыраныя фармальныя прававыя абгрунтаванні для трансмежных рэпрэсій. Спіс злачынстваў, адказнасць за якія чалавек нясе паводле КК Беларусі пры здзяйсненні на тэрыторыі іншай дзяржавы, пашыраны з 3 да 17. Першапачаткова пры ўвядзенні гэтай рэпрэсіўнай нормы (п. 1-1 арт. 6) да такіх складаў належалі тры склады, звязаныя з разгалошваннем службовай ці дзяржаўнай таямніцы.

Цяпер гэта вельмі шырокі спектр, пад які падпадае практычна любая дзейнасць не толькі прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў, але і экспертаў, праваабаронцаў і проста актыўных беларусаў, што жывуць за мяжой.

- Новыя праявы набывае трэнд, які распачаўся з 2023 — адыход ад прынцыпу фармальнай роўнасці. Нягледзячы на шэраг пазітыўных зменаў заканадаўства па пытаннях крымінальнай адказнасці (змякчэнне пакарання, альтэрнатыўныя пакаранні), многія такія змякчэнні не распаўюджваюцца на людзей, якія здзейснілі «злачынствы экстрэмісцкай скіраванасці», г.зн. фактычна на палітычна матываваныя крымінальныя справы. Такое выключэнне наўпрост прапісанае ў палажэннях, якія датычаць адмены пакарання ў выглядзе пазбаўлення свабоды і адмены заключэння пад варту як меры стрымання.

- Эвалюцыянуе трэнд уключэння крытэрыя лаяльнасці да ўлады у патрабаваннях для доступу да прафесіі: узмацняюцца ўмовы доступу да прафесіі для новых прафесійных груп, пашыраюцца фармальныя падставы для іх адвольнага пераследу. У апошнім трыместры 2024 г. да гідаў-перакладчыкаў і натарыусаў дадаліся педагагічныя работнікі, якія працуюць з дзецьмі (гэты тэрмін шырэйшы, чым настаўнікі). Для іх змяніўся пералік крытэрыяў, якія дазваляюць працаваць з дзецьмі, і правілы прёму на працу. Усе гэтыя меры пазіцыянуюцца як скіраваныя на абарону дзяцей.

- Пры гэтым фармалізаваныя падставы для адвольнага абмежавання права дзяцей на свабоду асацыяцыі: у Законе аб правах дзіцяці змененая фармулёўка адпаведнага артыкула і цяпер абмежаванне для свабоды асацыяцыі гучыць як «...пры ўмове, што дзейнасць гэтых аб’яднанняў не мае на мэце ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці, іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам, або тых, што дапускаюць магчымасць ажыццяўлення згаданых дзейнасці і дзеянняў падчас дасягненняў правамерных мэтаў стварэння».

- Атрымлівае новае развіццё палітыка і практыка пераследу ЛГБТК+ супольнасці. Па-першае, на заканадаўчым узроўні пашыраны пералік інфармацыі, якая можа прынесці шкоду здароўю і развіццю дзіцяці - дададзеная інфармацыя «скіраваная на прапаганду гомасэксуальных стасункаў, змены полу, педафіліі, бяздзетнасці». Па-другое, у апошнім трыместры 2024 г. узмацніўся прамы пераслед ЛГБТК+ супольнасці (затрыманні, арышты).

- Пашыраецца (і тэрытарыяльна, і прадметна) прымяненне неправавых пазасудовых працэдур, не забяспечаных ніякімі працэсуальнымі гарантыямі - пашыраныя кампетэнцыя і тэрміны працы Камісіі па вяртанні: дзейнасць Камісіі становіцца пастаяннай; у Камісію цяпер могуць звяртацца не

толькі беларусы, якія знаходзяцца за мяжой, але і беларусы ўнутры краіны «у адпаведнасці з даручэннем прэзідэнта»; пашырылася кола пытанняў, па якіх Камісія можа прымаць рашэнні ў тым ліку з'яўляецца магчымасць прыняцця «іншых рашэнняў, абумоўленых рэалізацыяй рашэнняў прэзідэнта».

- Новы вiток атрымлівае фармалізацыя праўладных наратываў аб падзеях 2020 года ў навучальнай літаратуры ў рамках школьнай адукацыі. Па словах міністра адукацыі А. Іванца новы падручнік па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі ў рамках сусветнай гісторыі» (будзе выкарыстоўвацца ў школах з 2025-2026 навучальнага году) разглядае падзеі 2020 як спробу дзяржаўнага перавароту. Гэта з'яўляецца інструментам ціску на дзяцей і іх бацькоў у кантэксце недапушчэння любых пратэстных настрояў; стыгматызацыі пратэстных паводзін; стыгматызацыі людзей, якія прытрымліваюцца меркавання, адрознага ад афіцыйнай пазіцыі; стыгматызацыі і маргіналізацыі ўдзельнікаў мірных пратэстаў 2020 г., рэпрэсаваных людзей; як следства, ствараецца і паглыбляецца глеба для ўзнікнення варажнечы паміж рознымі часткамі беларускага грамадства.

- Адначасова прыняты шэраг пазітыўных зменаў у сферы пенсійнага забеспячэння: адмяняецца абмежаванне на пенсійныя выплаты працуючым пенсіянерам; усталяваныя льготы па вылічэнні страхавога стажу для жанчын, якія нарадзілі 4-х дзяцей (страхавы стаж зніжаны з 10 да 5 гадоў); бацькам, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю без удзелу маці, зніжаны ўзрост выхаду на пенсію на 5 гадоў; павышана пенсія дзецям з інваліднасцю да 18 гадоў, якія страцілі кармільца. У той жа час у жніўні 2024 года прапанаваныя змены, якія істотна ўрэзалі значныя пенсійныя гарантыі людзям, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі.

- Сярод новых тэндэнцый у правапрымяняльнай практыцы, якая парушае правы чалавека – новыя практыкі кантролю ў сувязі з перасячэннем мяжы: супрацоўнікі КДБ пачалі гутарыць з бацькамі, чые дзеці жывуць за мяжой; пашыраецца ціск на працоўных месцах: у некаторых школах увялі «часопісы перамяшчэння работнікаў» падчас «фортачак»; новыя практыкі пры затрыманні: перад затрыманнем у чалавека адключаецца інтэрнэт; новае ў перасledзе па артыкулах аб экстрэмізме: экстрэмісцкім прызнаны рэсурс для адпраўкі лістоў «Ліст.бел», які актыўна выкарыстоўваецца для лістоў палітвязням.

- Агульным фонам палітыкі і практыкі, якая ўплывае на сітуацыю з правамі чалавека ў канцы 2024 былі сёмыя ў гісторыі незалежнай Беларусі прэзідэнцкія выбары*[3]-2025. Некаторыя з апісаных у гэтым дакладзе

мераў (як станоўчых, так і негатыўных) можна разглядаць як прынятыя ў сувязі з выбарамі*. У цэлым выбары* узмацнілі рэпрэсіўны фон, але не прывялі да прынцыповых, якасна новых зменаў ні на ўзроўні палітыкі, ні на ўзроўні практыкі (падрабязней гл. справаздачы кампаніі БХК і ПЦ Вясна «Праваабаронцы за свабодныя выбары»).

- У кантэксце новых рэакцый міжнароднай супольнасці на сітуацыю ў Беларусі можна адзначыць значны крок Літвы. Яна звярнулася ў Міжнародны крымінальны суд з просьбай расследаваць меркаваныя злачынствы супраць чалавечнасці, уключаючы дэпартацыю, пераслед і іншыя бесчалавечныя акты, якія ўчыняюцца ў Беларусі з мая 2020 года па сённяшні дзень. У цяперашні час Офіс Пракурора ажыццяўляе папярэднюю праверку атрыманай інфармацыі, улічваючы пытанні юрысдыкцыі, прымальнасці і інтарэсаў правасуддзя, і вызначае, ці ёсць разумныя падставы для пачатку расследавання.

[3] *Тэрмін «выбары*» у дачыненні да выбарчай кампаніі 2025 г. выкарыстоўваецца з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключаючы свабоду слова, свабоду мірных сходаў і асацыяцый, права ўдзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабоду ад дыскрымінацыі, што цяпер у Беларусі практычна адсутнічае.*

# I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- пералік злачынстваў за якія можна несці адказнасць па КК Беларусі пры здзяйсненні іх а мяжой павялічыўся з 3 да 17;
- забарона на прафесію для педагагічных працаўникоў, якія работаюць з дзецьмі і былі асуджаны па «палітычных артыкулах», фармалізацыя «палітычнага фільтру» пры прыеме на працу на такія пасады;
- пашыраны пералік інфармацыі, якая можа прынесці шкоду здароўю і развіццю дзіцяці - дададзеная інфармацыя «скіраваная на прапаганду гомасэксуальных стасункаў, змены полу, педафіліі, бяздзетнасці».

## ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СІСТЭМНАХ РЭПРЭСІЙ

1. У верасні 2024 г. у першым чытанні[4] прынятыя папраўкі ў заканадаўства па пытаннях крымінальнай адказнасці.[5] З аднаго боку, яны ўтрымліваюць шэраг пазітыўных змен, з другога - з'яўляюцца новыя падставы для палітычна матываванага пераследу. Пры гэтым, важна адзначыць узмацненне жорсткасці шэрагу і так новых, нядаўна прынятых рэпрэсіўных нормаў.

**Па-першае, пашыраецца пералік гарантый і абароны ў дачыненні да прэзідэнта, у тым ліку і былога**:

- пашыраецца пералік складаў, звязаны з дзеяннямі ў дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У КК уводзіцца новы склад:

[4] *На момант выхаду дадзенага аналізу прынятыя ў другім чытанні (у студзені 2025 г.).*
[5] *Крымінальны кодэкс, Крымінальна-працэсуальны кодэкс, Крымінальна-выканаўчы кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.*

арт. 366-1 «Гвалт або пагроза ў дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у тым ліку таго, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў» (да таго былі склады, якія тычацца паклёпу і абразы прэзідэнта). Раней за гвалт у дачыненні да прэзідэнта мог прымяняцца агульны арт. 366 КК, які тычыцца гвалту ў дачыненні да службовай асобы. Новы склад распаўсюджваецца таксама на і сям'ю прэзідэнта і змяшчае больш строгія санкцыі, чым у агульным арт. 366;

- наяўныя склады арт.арт. 367 і 368 (паклёп і абраза прэзідэнта адпаведна) дапоўнены фармулёўкай «у тым ліку той, што спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў». Важна адзначыць, што артыкулы, звязаныя з абразай, паклёпам у дачыненні да прэзідэнта актыўна выкарыстоўваюцца ўладамі для палітычна матываванага пераследу.

- уведзеныя новыя матэрыяльныя нормы, забяспечаныя працэсуальнымі нормамі. Пашыраецца пералік выпадкаў (арт. 174 КПК), пры якіх прыняццё рашэнняў па заявах або паведамленнях аб злачынствах адносіцца да выключнай кампетэнцыі органаў папярэдняга следства ў адпаведнасці з іх падследнасцю, і да пракурора. Да такіх выпадкаў дададзеная фармулёўка «аб злачынствах, учыненых у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў у сувязі са сканчэннем тэрміну знаходжання на пасадзе або датэрмінова ў выпадку яго адстаўкі або стойкай няздольнасці па стане здароўя ажыццяўляць абавязкі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, членаў яго сям'і».

Увядзенне новага складу, пашырэнне яго на сям'ю прэзідэнта, а таксама распаўсюд наяўных складаў на былога прэзідэнта, з аднаго боку, дадае падставы для адвольнага пераследу нязгодных, з другога - відавочна сведчыць аб жаданні забяспечыць гарантыі А. Лукашэнку пасля змены ўлады. Гэта працяг трэнду, які пачаўся з істотных зменаў Закона аб прэзідэнце ў пачатку 2024 года, якія тычацца таксама гарантый былому прэзідэнту і яго сям'і. Разам з тым, наўрад ці можна сказаць, што сам па сабе зменены ўказ уяўляе патэнцыйную небяспеку ў якасці інструмента для адвольнага і палітычна матываванага пераследу. Хутчэй ён змяшчае пазітыўныя абавязальніцтвы новай улады па забеспячэнні гарантый былому прэзідэнту. Увядзенне крымінальнай адказнасці за гвалт або пагрозу, паклёп і абразу былога прэзідэнта і чальцоў яго сям'і, улічваючы беларускі кантэкст - відавочна ператварае такія гарантыі ў патэнцыйны інструмент адвольнага пераследу.

**Па-другое**, уводзіцца **новы артыкул — арт. 375-3 «Несанкцыянаваны распаўсюд інфармацыі аб размяшчэнні ці перамяшчэнні падраздзяленняў, узбраення, ваеннай тэхнікі і боепрыпасаў»**. Санкцыя па ёй прадугледжвае штраф, або арышт,

або абмежаванне волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленне волі на той жа тэрмін, пры здзяйсненні групай, або з карыслівых памкненняў, або пры цяжкіх наступствах - да шасці гадоў.

Відавочна, што ўвядзенне такога складу звязанае з вайной ва Украіне і накіраванае на пераслед людзей, якія паведамляюць аб перамяшчэннях расійскай тэхнікі па тэрыторыі Беларусі. Да таго людзей пераследавалі за такія дзеянні па іншых артыкулах: спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 361-4), удзел у экстрэмісцкім фармаванні (361-1), здрада дзяржаве (356). Два першыя артыкулы таксама былі дададзеныя раней, каб пашырыць фармальныя падставы для палітычна матываванага пераследу.

**Па-трэцяе**, істотна пашыранае экстэрытарыяльнае прымяненне КК РБ: пералік складаў, адказнасць за якія чалавек нясе па КК Беларусі, калі не быў прыцягнуты ў замежнай дзяржаве. Калі першапачаткова пры ўвядзенні гэтай рэпрэсіўнай нормы (п. 1-1 арт. 6) да такіх складаў адносіліся тры[6], то цяпер, разам з новымі складамі іх стала 17[7]. Пералік уключае ў сябе вельмі шырокі спектр складаў: ад рэабілітацыі нацызму, адмаўлення генацыду беларускага народа і дыскрэдытацыі Беларусі да арганізацыі дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі. Важна падкрэсліць, што пад гэты пералік складаў падпадае практычна любая прафесійная дзейнасць не толькі прадстаўнікоў дэмакратычных сіл ці публічных дзеячаў апазіцыйнага руху, але і экспертаў, праваабаронцаў і проста актыўных беларусаў. **Такім чынам, гэта новаўвядзенне істотна пашырае інструментарый трансмежных рэпрэсій у дачыненні да тых, хто вымушана з'ехаў, магчымасць заводзіць на іх новыя крымінальныя справы**.

**Па-чацвёртае**, , важна адзначыць, што ў цэлым прапанаваны буйны масіў зменаў, накіраваны на гуманізацыю заканадаўства па пытаннях крымінальнай адказнасці, які ў іншых умовах (у тым ліку пры наяўнасці ўмоваў для працы ў краіне праваабаронцаў) мог бы стаць базай для добрай рэформы крымінальнай палітыкі. У цяперашніх умовах, паралельна з пазітыўнымі зменамі працягваюць уводзіцца новыя рэпрэсіўныя нормы. Пры гэтым уводзячы пазітыўныя змены, накіраваныя на змякчэнне і гуманізацыю пакарання,[8] дзяржава **не гатовая распаўсюджваць іх на людзей, якія пераследуюцца па палітычных матывах**.

[6] *Пры гэтым, важна адзначыць, што сам па сабе п. 1-1 быў дададзены ў арт.6 як выключэнне з агульнага правіла крымінальнай адказнасці за дзеянні, учыненыя за мяжой (за такія злачынствы можна судзіць, калі яны з'яўляюцца злачынствамі і па крымінальным заканадаўстве краіны, дзе былі ўчыненыя і калі чалавек не быў прыцягнуты ў гэтай краіне) і замацаваў тры склады для палітычна матываваных. 373, 374, 375 (усе тры звязаныя з разгалошванне дзяржаўнай або службовай таямніцы).*

[7] *Арт. арт. 130 – 130-2, 289 – 290-5, 367 – 369-1, 370, 373, 374.*

[8] *У прыватнасці, прадугледжваецца перагляд санкцый па 97 складах злачынстваў. Санкцыі 65 складаў прапануецца дапоўніць альтэрнатыўнымі, больш мяккімі відамі пакаранняў. А санкцыі 32 складаў - скарэктаваць у часткі памеру пакаранняў або ўвядзення на альтэрнатыўнай аснове дадатковых пакаранняў (штраф, пазбаўленне права): https://news.zerkalo.io/economics/78552.html.*

У прыватнасці, на людзей, якія здзейснілі «злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці», не распаўсюджваюцца такія змякчаныя нормы:

- адмена пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў або дзяцей з інваліднасцю, людзей з інваліднасцю I групы, якія ўпершыню ўчынілі злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства; людзям, якія ўпершыню ўчынілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства.

- адмена заключэння пад варту ў якасці меры стрымання (прычым гэтае выключэнне адзначанае нават у пункце аб асобах, якія церпяць на цяжкае захворванне, якія ўчынілі злачынствы, не спалучаныя са шкодай жыццю і здароўю чалавека).

Гэта чарговая, новая яркая праява тэндэнцыі адыходу ад прынцыпу фармальнай роўнасці, якая сістэмна пачала праяўляцца з 2023.

2. Пастаянна ўзмацняюцца патрабаванні для доступу да канкрэтных прафесій для розных прафесійных груп. Гэта адбываецца праз фармалізацыю патрабаванняў лаяльнасці ўлады: у апошнім трыместры 2024 г. да гідаў-перакладчыкаў (другая палова 2023 і другі трыместр 2024) і натарыусаў (другі трыместр 2024) дадалося ўзмацненне для **педагагічных работнікаў** (гэтая катэгорыя шырэйшая, чем настаўнікі).[9]

У снежні Савет Міністраў прапанаваў папраўкі да заканадаўства па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей[10]. Паводле паправак:

- **па-першае**, для людзей, якія працуюць з дзецьмі, уводзіцца «**псіхалагічнае сумоўе**» як абавязковая стадыя прыёму на працу педагагічнага работніка, а яго паспяховае праходжанне - абавязковы крытэрый для заняцця педагагічнай пасады. Парадак такой гутаркі будзе вызначаць ўрад. Відавочна, што падобная гутарка з'яўляецца фільтрам, які накіраваны на адсейванне патэнцыйна нелаяльных кандыдатаў.

9 *Паводле Кодэксу аб адукацыі, да педагагічных работнікаў адносяцца людзі, якія: рэалізуюць змест адукацыйных праграм, праграм выхавання, ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі і (або) ажыццяўляюць кіраўніцтва адукацыйнай дзейнасцю ўстановы адукацыі, яе структурных падраздзяленняў.*

10 *Закон «Аб правах дзіцяці», Кодэкс аб шлюбе і сям'і, Кодэкс аб адукацыі, Закон «Аб фізічнай культуры і спорце», Закон «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў».*

- **па-другое**, дапаўняецца палажэнне аб абмежаваннях на працу з дзецьмі (арт. 27-1 Закона аб правах дзіцяці). Палажэнне замацоўвае пералік складаў, пры наяўнасці судзімасці па якіх чалавек не можа займаць педагагічную пасаду. Там змяшчаецца шырокі пералік злачынстваў, якія тычацца пазбаўлення жыцця, давядзення да самагубства, палавой недатыкальнасці, незаконнага звароту наркотыкаў, парнаграфіі і інш.[11] У якасці новых зменаў гэты пералік **дапаўняецца фармулёўкай «злачынствы экстрэмісцкай скіраванасці».** Гэта прадугледжвае вельмі шырокае кола складаў і пералік дзеянняў[12], якія вельмі актыўна выкарыстоўваюцца ўладамі для адвольнага пераследу па палітычных матывах (гл., напрыклад, аналіз Human Constanta з красавіка да верасня 2024). Частка складаў, аднесеных уладамі да экстрэмізму ў мэтах палітычнага пераследу, носяць негвалтоўны характар і не з'яўляюцца злачынствамі супраць асобы.

- **па-трэцяе**, уносяцца змены ў патрабаванні, якія прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў, якія вызначаюцца Кодэксам аб адукацыі (арт. 51), Законам аб правах дзіцяці (арт. 27-1) і Законам аб фізічнай культуры і спорце (арт. 69), якія датычацца прыёму на працу. Цяпер усе ўстановы адукацыі пры прыёме на працу людзей, якія прэтэндуюць на педагагічныя пасады, павінны будуць **тлумачыць** такім людзям заканадаўства, "датычнае абароны дзяцей ад злачынстваў экстрэмісцкай скіраванасці, злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 139, 145 – 147, 154, часткамі 2 і 3 артыкула 165, раздзелам 20, артыкулам 172, часткай 2 артыкула 173, артыкуламі 181 – 182, 187, 327 – 329, 331, 332, 342-1, 343 и 343-1 Крымінальнага Кодэксу Рэспублікі Беларусь" і **знаёміць іх пад роспіс** з прававымі наступствамі невыканання патрабаванняў заканадаўства.

Важна згадаць, што пералік артыкулаў для тлумачэння пры прыёме на працу эквівалентны пераліку артыкулаў, пры наяўнасці судзімасці па якіх немагчыма займаць педагагічныя пасады. Такі пералік быў істотна пашыраны больш раннімі зменамі: першапачаткова там было 6 складаў, якія тычацца ўцягвання непаўналетніх у злачынствы, гандлю людзьмі і выкарыстання нявольніцкай працы, а таксама распаўсюду парнаграфіі. Пазней яго пашырылі да 25 складаў. Такім чынам, і перад дададзеннем апошнімі зменамі «палітычных» артыкулаў – «злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці», такі шырокі пералік хутчэй

---

[11] *139, 145 – 147, 154, часткамі 2 і 3 артыкула 165, раздзелам 20, артыкулам 172, часткай 2 артыкула 173, артыкуламі 181 – 182, 187, 327 – 329, 331, 332, 342-1, 343 и 343-1.*

[12] *Крымінальнае заканадаўства фармальна вызначае «злачынства экстрэмісцкай скіраванасці» вельмі шырока: злачынствы, спалучаныя са здзяйсненнем наўмысных дзеянняў, якія адносяцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі да экстрэмізму, а таксама іншае злачынства, прадугледжанае Крымінальным кодэксам, здзейсненае па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці альбо па матывах варожасці ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы.*

скіраваны на тое, каб запалохаць спачатку настаўнікаў, а праз іх – дзяцей, чым забяспечыць прафілактыку праваапарушэнняў сярод непаўналетніх і абараніць іх. Пасля таго як апошнімі зменамі да іх дадалі «злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці», якія выкарыстоўваюцца для палітычнага пераследу, да агульнага рэпрэсіўнага характару дадаўся палітычны аспект. У цяперашніх умовах гэта спрыяе ўзмацненню самацэнзуры сярод настаўнікаў і, адпаведна, рэтрансляцыі гэтага на дзяцей.

Такім чынам, улічваючы ўсе згаданыя новаўвядзенні ў сукупнасці, усталёўваецца жорсткі палітычны фільтр для педагагічных работнікаў, якія працуюць з непаўналетнімі. Пры гэтым, паводле гэтых палажэнняў, чалавек не можа займаць педагагічных пасадаў, быўшы судзімым за здзяйсненне ўсіх згаданых злачынстваў, **незалежна ад пагашэння ці зняцца судзімасці**, а таксама спынення крымінальнага пераследу па амністыі або з-за заканчэння тэрміну даўнасці. Гэта сведчыць пра тое, што ўжо рэпрэсаваныя педагагічныя работнікі ні пры якіх умовах не змогуць вярнуцца да сваёй прафесійнай дзейнасці і маюць **пажыццёвую забарону на прафесію** (пакуль рэжым А.Лукашэнкі знаходзіцца пры ўладзе). Таксама пажыццёвую забарону на такую дзейнасць атрымліваюць рэпрэсаваныя людзі, якія не працавалі на такіх пасадах, але жадаюць займацца педагагічнай дзейнасцю. Асабліва ўразлівай групай у гэтым кантэксце будуць выпускнікі ВНУ, у якіх адзіная ці дадатковая кваліфікацыя - настаўнік, педагог.

Тыя людзі, якія ўсё ж змогуць прайсці гэты фільтр, будуць падвяргацца дадатковаму ціску, які ўзмацняе самацэнзуру, якая стварае атмасферу страху, што, у сваю чаргу, спараджае змушаную лаяльнасць дзяржаве і ставіць чалавека ў цалкам залежнае становішча ад волі кіраўніцтва.

3. Гэтымі ж папраўкамі да заканадаўства па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей уносяцца змены ў Закон аб правах дзіцяці, якія адвольна абмяжоўваюць **правы дзяцей на свабоду асацыяцыі** (ст. 26). Абмежаванне на стварэнне дзіцячых і моладзевых грамадскіх аб'яднанняў, якое змяшчаецца ў Законе, зараз гучыць так: «...дзейнасць гэтых аб'яднанняў не мае на мэце гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу або вядзення прапаганды вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці». Рэдакцыя артыкула дадае рэпрэсіўныя падставы і істотна пашырае магчымасці для адвольнага тлумачэння забароны на стварэнне такіх аб'яднанняў: «...пры ўмове, што дзейнасць гэтых аб'яднанняў не мае на мэце ажыццяўлення тэрарыстычнай і іншай экстрэмісцкай дзейнасці, іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам, або дапускаюць магчымасць ажыццяўлення названых дзейнасці і дзеянняў у ходзе дасягнення праваамерных мэт стварэння».

4. У лістападзе стала вядома, што Дзяржаўны памежны камітэт (ДПК) паведаміў аб ініцыятыве надзяліць супрацоўнікаў памежнай службы правам ажыццяўляць дактыласкапаванне ў дачыненні да «пэўнай катэгорыі замежнікаў» пры іх уездзе

ў Рэспубліку Беларусь. Такая прапанова была падтрыманая дэпутатамі пастаянных камісій Парламента па нацыянальнай бяспецы і міжнародных справах. Кіраўнік юрыдычнага ўпраўлення ДПК адзначыў, што «такая карэкціроўка заканадаўства звязана з ваенна-палітычнай абстаноўкай, якая склалася на нашых межах». У адсутнасць тэксту нарматыўнага акта складана зрабіць выснову аб канкрэтных парушэннях правоў чалавека. Разам з тым, улічваючы агульную тэндэнцыю антызаходніцтва, канцэпцыю «непрыхільных дзяржаваў», якой ужо каля 2-х гадоў аперуюць улады, абноўленую Ваенную дактрыну, можна чакаць маніпуляцый з нагоды нібыта нацыянальнай бяспекі для адвольнага збору біяметрычных звестак, што з'яўляецца, як мінімум, парушэннем права на прыватнае жыццё.

## ПАЛІТЫКА ПА ФАРМАЛІЗАЦЫІ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ ПА ПРЫКМЕТАХ СЭКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ, ГЕНДЭРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ І РЭПРАДУКЦЫЙНАГА ВЫБАРУ

Прыкметнае ўзмацненне рэпрэссіўнай кампаніі супраць ЛГБТ+ супольнасці на ўзроўні палітыкі пачалося з першага паўгоддзя 2023. Пасля пастаянных выказванняў на афіцыйным узроўні аб неабходнасці фармалізацыі забароны «прапаганды ЛГБТК, нетрадыцыйных сэксуальных адносін» у пачатку 2024 г. у беларускім заканадаўстве з'явілася першая фармальная нарматыўная аснова, якая стварае глебу для сістэмных дыскрымінацыйных практык і сістэмных пераследаў на падставах сэксуальнай арыентацыі, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадуктыўнага выбару: змены ў вызначэнні «парнаграфіі» у інструкцыі Міністэрства культуры.[13.]

Да канца года стала відавочна, што тэндэнцыя працягваецца і развіваецца на новых узроўнях. Згаданыя вышэй прапанаваныя папраўкі у Закон аб правах дзіцяці пашыраюць пералік інфармацыі, «якая прычыняе шкоду здароўю і развіццю дзяцей» (арт. 37-1 Закона) і дадаюць да пазіцыі «інфармацыя, якая дыскрэдытуе інстытут сям'і і шлюбна-сямейныя адносіны» такую фразу: «**накіраваная на прапаганду гомасэксуальных адносін, змены полу, педафіліі, бяздзетнасці».**

Гэта, у тым ліку, азначае, што такую інфармацыю[14] нельга цяпер распаўсюджваць без прысваення знаку ўзроставай катэгорыі. Пры гэтым характэрна, што дзяржава працягвае ставіць у адзін шэраг аднаполыя сэксуальныя адносіны, змену полу і чайлдфры-перакананні са злачынствам - педафіліяй. Такі падыход быў таксама

13 *Гл. падрабязны аналіз БХК: https://belhelcom.org/ru/news/bezopasno-li-teper-imet-akkaunt-s-ukazaniem-seksualnoy-orientacii-v-prilozhenii-dlya-znakomstv*

14 *У розных формах: прадукцыя сродкаў масавай інфармацыі, друкаваных выданняў, аўдыёвізуальных твораў, фанаграм, гульняў, у тым ліку гульняў з электронным дысплеем, камп'ютарных гульняў і праграм на любых відах носьбітаў, або ў выглядзе інфармацыі, якая распаўсюджваецца з дапамогай культурных мерапрыемстваў. Зменамі да гэтага пераліку дададзеныя і цацкі, якія з'яўляюцца рэплікай герояў камп'ютарных гульняў і фільмаў.*

скарыстаны пры змене інструкцыі Мінкульта. Разам з тым, калі ў інструкцыі Мінкульта гаворка ішла аб кантэксце парнаграфіі, і гэта давала магчымасць хаця б спрабаваць акрэсліць межы трактоўкі, то палажэнне Закона аб правах дзіцяці можа тлумачыцца неабмежавана шырока. Гэта будзе спрыяць дадатковай стыгматызацыі свабоды дзіцяці праяўляць сваю ідэнтычнасць, свабоднага рэпрадуктыўнага выбару, укараненне нармальнасці няроўнага абыходжання з людзьмі з іншай гендэрнай ідэнтычнасцю і сэксуальнай арыентацыяй, людзьмі, якія не жадаюць мець дзяцей і ўсімі, хто асацыюецца з такімі людзьмі або поглядамі.

## ПАШЫРЭННЕ ПРЫМЯНЕННЯ НЕПРАВАВЫХ, НЕСУДОВЫХ ПРАЦЭДУР

У кастрычніку ўказам А. Лукашэнкі змененыя паўнамоцтвы Камісіі па вяртанні, якая была створаная у лютым 2023 г. «у мэтах падтрымання грамадзянскай згоды і забеспячэння рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабодаў беларускіх грамадзян». Нягледзячы на такое пазіцыянаванне, дзейнасць Камісіі носіць рэпрэсіўны характар і з'яўляецца адвольным пазасудовым умяшаннем у працэсуальныя дзеянні (гл. аналіз БХК за першае паўгоддзе 2023 года).

У адпаведнасці са зменамі:

- па-першае, дзейнасць Камісіі становіцца сталай (першапачаткова тэрмін яе працы быў абмежаваны 31 снежня 2023 года, потым падоўжаны да 31 снежня 2024);

- па-другое, на дадатак да зваротаў грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за мяжой, сфера кампетэнцыі Камісіі пашыраная на звароты «іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з даручэннем прэзідэнта». Такім чынам, Камісія зможа разглядаць звароты і людзей, якія знаходзяцца ў Беларусі. Пры гэтым указана, што патрабаванні да зваротаў грамадзян з-за мяжы не распаўсюджваюцца на звароты «іншых грамадзян па даручэнні прэзідэнта». Застаецца незразумелым, якім патрабаванням павінны адпавядаць гэтыя звароты (у тым ліку ці павінен чалавек пісьмова раскаяцца, пазначыць абставіны прыцягнення да адказнасці і г.д.).

- па-трэцяе, пашыраны пералік пытанняў, па якіх Камісія можа прымаць рашэнні. Дабаўляюцца рашэнні аб правядзенні ў адносінах да чалавека праверкі згодна з крымінальным або адміністрацыйным працэсуальным заканадаўствам, наяўнасці або адсутнасці падставаў для яе. Апрача таго, дадаецца палажэнне аб магчымасці прыняцця «іншых рашэнняў, абумоўленых рэалізацыяй рашэнняў Прэзідэнта».

Такім чынам, мы назіраем пашырэнне (і тэрытарыяльнае, і прадметнае) паўнамоцтваў нейкага калегіяльнага несудовага органа з непразрыстай кампетэнцыяй, які ў рамках неправавой, пазасудовай працэдуры, без належнага ўліку, кантролю і працэсуальных гарантый вырашае пытанні, якія павінны вырашацца судом ці іншымі кампетэнтнымі органамі.

## ІНДАКТРЫНАЦЫЯ Ў АДУКАЦЫІ: ФАРМАЛІЗАЦЫЯ ПРАЎЛАДНЫХ НАРАТЫВАЎ АБ ПАДЗЕЯХ 2020

У сувязі з увядзеннем новага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» выпушчаны новыя падручнікі для 10 і 11 класаў. Міністр адукацыі А.Іванец у інтэрв'ю распавёў, што ў 2024-2025 навучальным годзе ў шэрагу школ будзе тэсціравацца (адпаведна з 2025-2026 навучальнага года запусціцца ў адукацыйны працэс) падручнік для 11 класа, які ўключае ў сябе і гісторыю Беларусі найноўшага часу. У гэтым падручніку падзеі 2020 года характарызуюцца як дзяржаўны пераварот, распавядаецца хто і чаму хацеў яго здзейсніць.

Нагадаем, што ў лістападзе 2023 былі прэзентаваныя тры новыя падручнікі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для 1-4, 5-9, 10-11 класаў. Іх падрыхтоўка з'яўляецца часткай вялікай дзяржаўнай кампаніі па рэфрэймінгу генацыду (гл. аналітыку БХК за студзень-чэрвень і ліпень-снежань 2023). У падручніку для 10-11 класаў праводзіцца прамая паралель паміж дзеяннямі нацыстаў і калабарантаў і мірнымі пратэстамі 2020 года. Паведамляецца, што людзі, якія ўдзельнічаюць у пратэстах, «падзялялі нацысцкія метады» і выкарыстоўвалі «нацысцкі лозунг Жыве Беларусь».

Разам з тым, падручнік па «генацыдзе беларускага народа», па-першае, забяспечвае факультатыўны прадмет (хаця ва ўмовах беларускай сістэмы адукацыі факультатыўнасць вельмі ўмоўная - дзяцей фактычна вымушаюць выбіраць гэты факультатыў), па-другое, напісаны ў рамках канкрэтнай тэматычнай кампаніі - адсюль і асноўнае параўнанне з нацыстамі і калабарантамі. Уключэнне ідэалагічных ацэнак падзей 2020 года ў падручнік гісторыі - падручнік па адным з асноўных прадметаў школьнай праграмы, па якім, у тым ліку, здаюцца выпускныя іспыты ў школе і ўступныя ў ВНУ (цэнтралізаваны іспыт) - паглыбляе ідэалагічную індактрынацыю і выводзіць яе на новы ўзровень.

На момант выхаду гэтага аналізу тэксту падручніка для 11 класа не было ў публічным доступе. Разам з тым, зыходзячы з агучанага А. Іванцом, зразумела агульная канва такога тэксту. Па-першае, гэта інструмент ціску на дзяцей і іх бацькоў у кантэксце недапушчэння любых пратэстных настрояў, стыгматызацыі

пратэстных паводзін, людзей, якія прытрымліваюцца думкі, адрознай ад афіцыйнай пазіцыі, стыгматызацыі і маргіналізацыі ўдзельнікаў пратэстаў 2020, рэпрэсаваных людзей.

Па-другое, ствараецца і паглыбляецца глеба для ўзнікнення супрацьстаяння, варажнечы паміж рознымі часткамі беларускага грамадства. Ад таго, колькі пакаленняў дзяцей будуць вучыцца па гэтых падручніках, залежыць глыбіня доўгатэрміновых сацыяльных эфектаў.

Усё гэта з'яўляецца парушэннем свабоды выказвання думкі, права на адукацыю, культурных правоў дзяцей (бо з дапамогай маніпуляцый матэрыял наўмысна стварае ў іх памылковае ўяўленні аб важных сацыяльных і палітычных падзеях, якія адбываюцца ў краіне).

## ЗМЕНЫ Ў СФЕРЫ ПЕНСІЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

У гэты перыяд прыняты шэраг пазітыўных зменаў у сферы пенсійнага забеспячэння, якія ўскосна можна звязаць з прэзідэнцкай кампаніяй-2025.

Указам А. Лукашэнкі № 402 «Аб сацыяльнай падтрымцы»:

- па-першае, адмяняецца абмежаванне на пенсійныя выплаты працуючым пенсіянерам (раней, у адпаведнасці з Законам аб пенсійным забеспячэнні, частка пенсіі, вылічаная з улікам заробку звыш 130 працэнтаў сярэдняга заробку ў перыяд працы не выплачвалася);

- па-другое, гэтым жа ўказам устаояваныя льготы па вылічэнні страхавога. стажу[15] для жанчын, якія нарадзілі 4-х дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту, страхавы стаж зніжаны з 10 да 5 гадоў;

- па-трэцяе, бацькам, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю як мінімум да 8-гадовага ўзросту, зніжаны ўзрост выхаду на пенсію на 5 гадоў (пры наяўнасці агульнага стажу не менш як 25 гадоў і не менш як 5 гадоў страхавога стажу), калі маці дзіцяці не набыла права на пенсію, або адмовілася ад набытага права на карысць бацькі, або памерла;

- па-чацвёртае, павышаная пенсія дзецям з інваліднасцю да 18 гадоў, якія страцілі кармільца.

---

[15] *Гл. інфаграфіку і аналіз БХК аб праблеме страхавога стажу ў Беларусі: https://pensii.belhelcom.org/*

З аднаго боку, гэта пазітыўныя і справядлівыя змены. Аднак пры гэтым, напрыклад, у дачыненні да пенсіянераў паказальная матывацыя ўладаў. Так, у тэксце ўказа ў якасці мэты ўказана «ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі», у каментарах да ўказа на сайце прэзідэнта адзначана, што такая мера «дазволіць павысіць эфектыўнасць выкарыстання на рынку працы асобаў пенсійнага веку». Акрамя таго, важна адзначыць, што ў другім трыместры 2024 улады істотна зрэзалі пенсійныя гарантыі пенсіянерам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, што, відавочна, звязана з недахопам у дзяржавы грошай.

Такім чынам, нягледзячы на пазітыўныя фактычныя змены, улады, прымаючы меры сацыяльнай падтрымкі, зыходзяць не з выгоды чалавека, а з патрэб «народнай гаспадаркі».

Гэта ў чарговы раз дэманструе бязладны, супярэчлівы, спажывецкі падыход да рэалізацыі сацыяльных і эканамічных правоў - не з пункту гледжання таго, што яны абавязаны забяспечыць чалавека, а з пункту гледжання «падарунка», які можна даць, а потым - калі трэба - забраць.

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ

ГАЛОЎНАЕ:

- узмацненне пераследу ЛГБТК+ супольнасці;

## ПЕРАСЛЕД ЛГБТК+ СУПОЛЬНАСЦІ

Узмацненне рэпрэсіўнай кампаніі супраць ЛГБТК+ супольнасці на ўзроўні заканадаўчай палітыкі (гл. вышэй у гэтай справаздачы) суправаджалася ў апошнім трыместры 2024 года новым вітком практыкі прамога пераследу. Так, паводле інфармацыі ПЦ «Вясна», толькі ў верасні 2024 года, у розных гарадах Беларусі былі затрыманыя і падвергнутыя гвалту больш за 30 квір-актывістаў, у тым ліку як мінімум 10 транс-персон, некаторыя з якіх сутыкнуліся з сур'ёзнымі абвінавачваннямі і пагрозай турэмнага зняволення. Гэтыя рэпрэсіўныя меры прывялі да росту колькасці ЛГБТК+ асоб, якія шукаюць прыстанішча за мяжой, баяцца пераследу і адмовы ў прадастаўленні неабходных медыцынскіх паслуг.

Паводле публічна даступнай інфармацыі, часцей за ўсё затрыманых абвінавачвалі ў «дробным хуліганстве» (арт. 19.1 КаАП РБ) і падпісках на так званыя «экстрэмісцкія» рэсурсы (арт. 19.11 КаАП РБ). Прычым у некаторых выпадках сілавікі самі падпісвалі людзей на такія рэсурсы, каб мець падставу для затрымання. Акрамя таго, пацверджаныя, прынамсі, два выпадкі, калі была ўжытая арт. 343 КК РБ «Выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў».

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ КАНТРОЛЮ Ў СУВЯЗІ З ПЕРАСЯЧЭННЕМ МЯЖЫ

Супрацоўнікі КДБ пачалі выклікаць для гутарак пры перасячэнні мяжы новую катэгорыю людзей - бацькоў тых, хто жыве за мяжой. Некаторым з іх задавалі пытанні пра тое, чаму іх дзіця з'ехала і прасілі патэлефанаваць і ўгаварыць вярнуцца на радзіму.

## УЗМАЦНЕННЕ КАНТРОЛЮ НА ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАХ

Узмацніўся кантроль над настаўнікамі - як частка эвалюцыі трэнду кантролю на працоўных месцах. Гэты працэс атрымлівае новыя віткі з пачатку 2024, асабліва мацнее кантроль у сувязі з выездам за мяжу (гл. аналіз БХК за студзень-красавік і за май-жнівень 2024).

У кастрычніку стала вядома, што ў некаторых школах уводзяць «часопісы перасоўвання працаўнікоў». Настаўнікі павінны адзначацца ў такім часопісе, калі ў вольны час паміж урокамі («форткі») пакідаюць будынак школы.

Міністэрства адукацыі ў адказ на запыт журналістаў патлумачыла, што не ведае пра такую ініцыятыву і што кантроль над настаўнікамі - гэта абавязак дырэктара школы. Можна выказаць здагадку, што гэта ініцыятыва мясцовых улад або некаторых дырэктараў школ у адказ на агульныя ўказанні ўзмацніць кантроль над працаўнікамі. У сувязі з гэтым важна адзначыць, што пастаяннае нагнятанне атмасферы кантролю і страху стварае ўмовы, у якіх мясцовая ўлада/адміністрацыя любога ўзроўню пачынае інтэнсіўна прадпрымаць «папераджальныя» меры, рэзаніруючы з агульным фонам «закручвання шрубаў», якіх, цалкам магчыма, ніхто з вышэйстаячай улады і не патрабуе.

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ ПРЫ ЗАТРЫМАННЯХ

У апошнім трыместры 2024 года стала вядома аб новай практыцы супрацоўнікаў КДБ: перш, чым затрымаць чалавека, яму адключалі мабільную сувязь. Такую практыку сілавікі выкарыстоўвалі пры масавых затрыманнях у рэгіёнах 31 кастрычніка.

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ ПЕРАСЛЕДУ ПАВОДЛЕ АРТЫКУЛАЎ АБ ЭСТРЭМІЗМЕ

Прызнаны «экстрэмісцкім» сэрвіс па адпраўцы лістоў «Ліст.бел». Ён выкарыстоўваўся пры адпраўцы лістоў зняволеным, у тым ліку палітвязням. Сэрвіс быў зарэгістраваны ў Беларусі і ў яго была дамова з РУП «Белпошта». Пры гэтым, паводле інфармацыі журналістаў, толькі 10% адпраўленняў, якія праходзілі праз сэрвіс «Ліст.бел», былі адрасаваныя палітычным зняволеным, асноўныя атрымальнікі - гэта зняволеныя, асуджаныя не па «палітычных» артыкулах, іх чыста статыстычна больш у СІЗА і калоніях. Разам з тым, відавочна, што такая мера накіраваная менавіта на стварэнне дадатковых перашкод у камунікацыі з палітвязнямі.

У першым трэместры 2024 мы адзначалі іншыя практыкі пераследу па экстрэмісцкіх артыкулах, якія ажыццяўляюцца з такой жа мэтай. Напрыклад, кваліфікацыя аказання дапамогі палітвязням у выглядзе грашовых пераводаў і пасылак у якасці спрыяння экстрэмісцкай дзейнасці. Таксама ў рамках іншага артыкула кваліфікацыя ў якасці экстрэмісцкай дзейнасці – выкарыстанне самога статусу «палітвязень» ("публічная заведама непраўамерная легітымацыя дзеянняў асобаў, якія здзейснілі злачынства, у тым ліку шляхам надання ім псеўдастатусу «палітвязняў»).

«Экстрэмісцкі» статус паштовага сэрвісу цягне шэраг негатыўных наступстваў, магчымасцяў для пераследу людзей, якія карысталіся ім для адпраўкі лістоў: у тым ліку, напрыклад, крымінальнага пераследу за «спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці».

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ У РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ДАТЫЧАЦЬ СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

## ЗВАРОТ ЛІТВЫ Ў МІЖНАРОДНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ СУД У СУВЯЗІ З СІТУАЦЫЯЙ У БЕЛАРУСІ

30 верасня 2024 Літва звярнулася ў Міжнародны крымінальны суд з просьбай расследаваць меркаваныя злачынствы супраць чалавечнасці, у тым ліку дэпартацыю, пераслед і іншыя бесчалавечныя акты, якія здзяйсняюцца ў Беларусі як мінімум з траўня 2020 г. і да дня звароту.

Як сцвярджаецца ў звароце, элементы меркаваных злачынстваў былі ўчыненыя на тэрыторыі Літвы, дзяржавы-ўдзельніцы МУС, што робіць усталяванне юрысдыкцыі Суда магчымым, нягледзячы на тое, што Беларусь не з'яўляецца дзяржавай-удзельніцай. Такая інтэрпрэтацыя юрысдыкцыі вынікае з рашэння Палаты папярэдняй вытворчасці МУС у справе Бангладэш/М'янма, якая пастанавіла, што Суд можа ажыццяўляць юрысдыкцыю ў дачыненні да злачынства, звязанага з меркаванай дэпартацыяй народу рахінджа з М'янмы, якая не з'яўляецца дзяржавай-удзельніцай, паколькі некаторыя элементы злачынства мелі месца на тэрыторыі Бангладэшу - дзяржавы-ўдзельніцы.

Зварот дзяржавы-ўдзельніцы не прыводзіць да аўтаматычнага пачатку расследавання. Цяпер Офіс Пракурора ажыццяўляе папярэднюю праверку атрыманай інфармацыі, улічваючы пытанні юрысдыкцыі, прымальнасці і інтарэсаў правасуддзя, і вызначае, ці маюцца разумныя падставы для пачатку расследавання.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG